## *Памяці вучонага*

### ІВАН СІДАРАВІЧ СЕМЫКІН



Памёр Іван Сідаравіч Семыкін, член КПСС з 1944 года, загадчык кафедры навуковага камунізму Інстытута павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў грамадскіх навук пры Беларускім дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна, кандыдат гістарычных навук, дацэнт.

Іван Сідаравіч нарадзіўся 25 мая 1925 года ў сяле Яфімаўка Андрэеўскага раёна Арэнбургскай вобласці ў сям'і селяніна-бедняка. Пасля заканчэння сярэдняй школы ў 1942 годзе працаваў інспектарам райфінаддзела. З лютага 1943 па май 1944 года—курсант ваенна-пяхотнага вучылішча. З мая 1944 года—у дзеючай арміі, удзельнічаў у баях за вызваленне Польшчы і Германіі ад нямецкага фашызму, быў цяжка паранены.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны І. С. Семыкін працаваў інструктарам Керпінскага гаркома партыі Туркменскай ССР, ваенруком сярэдняй школы. У 1952 годзе закончыў гістарычны факультэт Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта імя М. В. Ламаносава. Тут жа ў 1961 годзе абараніў кандыдацкую дысертацыю. У 1964 годзе яму прысвоена вучонае званне дацэнта.

Педагагічную работу ў вышэйшай школе пачаў у 1953 годзе. Працаваў у Таганрогскім і Мінскім радыётэхнічных інстытутах, у Беларускім дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна. З 1974 года І. С. Семыкін—дацэнт кафедры навуковага камунізму ІПК пры БДУ імя У. І. Леніна, а з 1982 года—загадчык гэтай кафедры. Ён забяспечваў зладжаную работу выкладчыкаў і супрацоўнікаў, умела накіроўваў намаганні калектыву на рашэнне вучэбна-выхаваўчых і навуковых праблем, удасканаленне падрыхтоўкі грамадазнаўцаў.

Навуковыя інтарэсы І. С. Семыкіна былі звязаны з даследаваннем нацыянальных адносін, працэсу росквіту і збліжэння нацый у нашай краіне, дыялектыкі нацыянальнага і інтэрнацыянальнага ва ўмовах развітога сацыялізму. У выніку гэтых даследаванняў ён падрыхтаваў і надрукаваў больш 50 навуковых прац. Удзельнічаў у многіх усесаюзных, рэспубліканскіх тэарэтычных і метадычных канферэнцыях, быў навуковым рэдактарам шэрагу манаграфій і зборнікаў артыкулаў.

Таленавіты прапагандыст, выдатны педагог, нястомны працаўнік І. С. Семыкін шчодра аддаваў свой вопыт, веды і здольнасці навучанню студэнцкай моладзі, многа ўвагі ўдзяляў кіраўніцтву аспірантамі, падрыхтоўцы і павышэнню кваліфікацыі выкладчыкаў навуковага камунізму.

І. С. Семыкін актыўна ўдзельнічаў у грамадскім і палітычным жыцці універсітэта. У 1974—1975 гадах быў сакратаром партыйнага бюро ІПК, у 1983—1985 гадах—членам парткома універсітэта. Камуністы неаднаразова выбіралі яго ў склад кафедральнага бюро. Ён кіраваў секцыяй навуковага камунізму семінара выкладчыкаў грамадскіх навук Мінска, быў пазаштатным лектарам Мінскага абкома КПБ, рэгулярна выступаў з лекцыямі на семінарах прапагандыстаў, у працоўных калектывах, з'яўляўся членам рэдкалегіі часопіса «Веснік БДУ імя У. І. Леніна» (серыя грамадскіх навук).

За заслугі перад Радзімай І. С. Семыкін узнагароджан ардэнамі Аляксандра Неўскага, Айчыннай вайны І ступені, медалямі.

Светлая памяць аб Іване Сідаравічу Семыкіне—камунісце, вучоным, абаяльным чалавеку—назаўсёды захаваецца ў памяці ўсіх, хто ведаў яго і працаваў разам з ім.